СОК З ДАСТАЎКАЙ І З ЛЕДЗЯШАМІ

У ГОРАДЗЕ

Адным словам, мы накіраваліся за бярозавікам, як толькі з'явіліся паведамленні-запрашэнні на сайтах лясгасаў. Тым больш што другі год запар сок прадаюць на гандлёвай пляцоўцы Брэсцкага лясгаса па вуліцы Кобрынскай, і вітамінны прадукт можна купіць, не выязджаючы з горада.

Як сказана на сайце, папярэдне я патэлефанавала па нумары, які быў указаны. У адказ адразу запрасілі пад'язджаць. Справа была ў мінулую пятніцу, бліжэй да абедзеннага перапынку. Пад'ехалі прыкладна ў 13.15. У чарзе за сокам стаяла каля

дзясятка чалавек. І калі летась пластыкавыя ёмістасці па тоне вагой размяшчаліся проста ў кузаве магутнага МАЗа, то цяпер для іх змайстравалі адмысловы паддон-падстаўку. Апошняе вызваліла машыну, якая можа зрабіць некалькі рэйсаў за дзень. Сведчанне таму — яшчэ два аграмадныя «бідоны» збоку ў запасе.

Прыветлівы супрацоўнік лясгаса Давід Шаўшышвілі рэкламуе сваю прадукцыю: «Сок найсвяжэйшы. Толькі ранкам сабралі ад дрэў. Усяго трэці дзень гандлюем. Першы сок — самы лепшы. Калі ўжо ідзе нарыхтоўка тыдзень-два, сок становіцца крыху іншы на смак, не такі празрысты. Хоць гэта і не страшна, але ж лічыцца, што першы сок самы смачны». Чарга рухаецца хутка, бо, па-першае, некаторыя стаяць парамі, па-другое, працэс арганізаваны добра. Пакупнікі падыходзяць са сваёй тарай, прадавец адкручвае кран, устаўляе шланг у бітон ці бутлю. Пакуль запаўняецца вялікая пасудзіна, ён паспявае разлічыць пакупніка і выдаць чэк. Апошні з'яўляецца дакументам для вартаўніка, які падніме шлагбаум на выездзе. Усе заязджаюць на пляцоўку машынамі, бо купляюць па 50, 60, 80 літраў. Некаторыя, праўда, прыходзяць з пяцілітровымі пластыкавымі бутлямі, бяруць усяго некалькі літраў, каб папіць. Але асноўная маса пакупнікоў набывае сок для кансервавання, для квасу, бо летам, у спёку, бярозавік — найлепшы напой. Сок тут прадаецца па 36 капеек за літр. Такім чынам, 60 літраў абыходзіцца нам у 21,6 рубля. Прыходзім да высновы, што гэта выгадна, бо ехаць у лясніцтва, каб купіць там па 19,5 капейкі, эканоміяй не выглядае. На бензін больш патраціш.

НА ЛЯСНОЙ ДЗЯЛЯНЦЫ

Але ў лясніцтве ўсё ж давялося пабываць літаральна праз дзень. Наш добры знаёмы, былы сусед, папрасіў аб гэтым. Ён прадаў машыну па прычыне ўзросту і

50 літраў, згадзіўся дабавіць у спіс без чаргі. У яго, як высветлілася, у асноўным па 100 і 200 літраў замаўляюць. Такім чынам нам пашанцавала.

Павел падрабязна патлумачыў маршрут, сказаў, што трэба праехаць вёску Забалацце і стаць на ўзбочыне. Раней мы тут не бывалі, таму прыехалі амаль за паўгадзіны, адна машына ўжо стаяла. А потым падцягнуліся яшчэ дзевяць. Строга ў прызначаны час, дакладней у дзевяць раніцы, пад'ехаў нарыхтоўшчык Павел, з тэлефона зверыў усіх па прозвішчах і заяўках на колькасць літраў і падаў знак рухацца за ім. Такім вось працяглым картэжам мы і заехалі ў лес, дзе Павел, нібы вопытны рэгуліроўшчык, хутка размеркаваў кліентаў па дзялянках вызначанага квартала лясніцтва.

У лесе пакупнікі адно аднаму не перашкаджалі, самі хадзілі паміж бярозамі, адвязвалі мяшкі з сокам і напаўнялі свае бітоны. Ноччу крыху падмарозіла, таму ў асобных мяшках зверху плавала тонкая ледзяная скарынка. Але паміж дрэў холад не адчуваўся. Мы з жонкай суседа Святланай Канстанцінаўнай крыху пагулялі па лесе, убачылі нават першыя пралескі і вельмі абрадаваліся. А сусед Міхаіл Арцёмавіч з маім сынам хутка набралі замоўленыя 50 літраў, загрузілі ў машыну і накіраваліся на «блок-пост» нарыхтоўшчыка. Там ён падлічыў суму, выпісаў квіток і ўзяў грошы.

Сок у лясніцтве прадаецца па 19,5 капейкі за літр. Дарэчы, за апошнія чатыры гады цана выраслa толькі на 2,5 капейкі, таму ахвотных набыць вітамінны напой нямала. Варта сказаць, што людзі прыязджаюць з любой тарай. Неабавязкова набываць вялікія пасудзіны, з якой прыехаў наш сусед. Адзін мужчына наліваў з дапамогай варонкі 5-літровыя бутлі. Іх стаяла дзясяткі два. Затое зручна і лёгка грузіць, можна справіцца нават аднаму.

Сезон нарыхтоўкі соку на Брэстчыне толькі набірае разгон. За якасць напою леснікі адказваюць. Штогод сок на аналіз бярэ цэнтр стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, вывяраюць каля 30 паказчыкаў. Шкодных прымесяў альбо радыяцыі ў нашым бярозавіку няма, а вось вялікая колькасць вітамінаў і мікраэлементаў прысутнічае. Таму вельмі карысна ўжываць сок свежым.

Усяго ў гэтым годзе лясгасы Брэсцкага лесагаспадарчага аб'яднання плануюць прадаць насельніцтву каля 650 тон бярозавіку. Так што соку хопіць усім.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Чалавек у асяроддзі

Каму прыпынак перашкаджае?

Разважанне пра маёмасць і свядомасць

У адзіны дзень галасавання была на ўчастку ў новым мікрараёне Брэста, яго яшчэ называюць Зарэчным раёнам. Можна сказаць, адкрыла для сябе гэтую частку горада. Парадавала цікавае архітэктурнае рашэнне, якое падразумявае вялікія двары, шмат святла, што разам стварае адчуванне прасторы. Асабліва гэта прыкметна ў раёне вуліц Грунвальдскай і Барыса Маслава.

Гарадское асяроддзе сфарміравана не толькі кварталамі жылой забудовы з гандлёвымі пунктамі, тут размяшчаецца новы шматфункцыянальны медыцынскі цэнтр, узвышаецца купаламі новы храм, радуюць вока маладыя дрэўцы парку 1000-годдзя Брэста. А ў адзін з апошніх дзён лютага чытаю ў тэлеграм-канале гарвыканкама паведамленне пра шэсць прыпынкаў па вуліцы Барыса Маслава, якія пашкоджаны невядомымі.

Фота тэлеграм-канала.

Варта сказаць, што вуліца, названая імем героя вайны, ваеннага ўрача Барыса Маслава, уведзена ў эксплуатацыю ўсяго два гады таму. Для арганізацыі належнага транспартнага забеспячэння былі ўстаноўлены сучасныя і зручныя прыпыначныя павільёны. Цяпер яны стаяць спрэс з пабітым шклом, а месцамі і размаляваныя. Апошняе стала не толькі праблемай гарадскога бюджэту, бо рамонт абыдзецца ў круглую суму, але не магло не засмуціць большасць жыхароў раёна. Многія памятаюць, як урачыста адкрывалі новую паліклініку, самую буйную ў горадзе, як здавалі ў эксплуатацыю жыццёва важны аб'ект — пажарна-аварыйную часць. У памяці, як талакой садзілі новы парк, названы ў гонар тысячагадовага юбілею горада, як гарадскія службы праводзілі добраўпарадкаванне. Здавалася б, усё тут павінна быць прыгожым, доўга служыць людзям. Раён літаральна на вачах вырас на ўскраіне горада, побач — лясны масіў, з ранняй вясны можна пачуць птушыны хор — такая вось перавага над шумным, загазаваным цэнтрам горада. Як той казаў, жыві і радуйся. Але крывыя аўтографы вандалаў вяртаюць да сумнай рэчаіснасці: сярод нас шмат тых, каму разбураць прывычней, чым узводзіць, ствараць. Яны ад гэтага, як выглядае, атрымліваюць задавальненне.

Спецыялісты гарвыканкама напомнілі, што ўладкаванне аднаго прыпыначнага пункта абыходзіцца ў 16 тысяч рублёў, замена аднаго шкла пацягне на тысячу рублёў. А на адным з шасці пашкоджаных прыпынкаў разбіта пяць шкляных панэляў. Факт выклікаў хвалю абурэння ў сацсетках. Адны гараджане вінавацяць бацькоў, што недастаткова ўвагі ўдзяляюць выхаванню нашчадкаў. Паводле іх перакананння, гэта справа рук школьнікаў, якія сваю дурную энергію не выплюхваюць у спартыўных залах, а пасля ўрокаў ідуць біць шкло на прыпынках. Таксама ёсць версія, што шкло пацярпела падчас некалькіх марозных дзён. Адзін пасажыр грамадскага транспарту напісаў, што быў сведкам таго, як ранкам на яго вачах трэскаліся шкляныя панэлі. Яму запярэчылі, маўляў, трэснуць магло раней падбітае шкло.

Некаторыя прыпынкі былі пашкоджаны зусім не ў марозныя дні. Такога ж меркавання прытрымліваецца і галоўны інжынер Брэсцкага дарожна-эксплуатацыйнага прадпрыемства Эдвард Сырэвіч. Эдвард Часлававіч сказаў, што павільёны пацярпелі не толькі тут, ёсць выпадкі псавання прыпыначных пабудоў каля абласной бальніцы, па вуліцы Маскоўскай, на бульвары Касманаўтаў.

...Новае шкло ўжо заказана, днямі спецыялісты заменяць тыя шкляныя панэлі, што былі пашкоджаны. Але ж непрыемны асадак застаецца: ці надоўга, ці не знойдзецца зноў нейкі зламыснік, што замахнецца на гарадскую маёмасць, сапсуе прыгажосць, а заадно і настрой пасажыраў грамадскага транспарту.

На жаль, вынікі непрыстойных паводзін суайчыннікаў у грамадскіх месцах даводзіцца канстатаваць не толькі ў абласным цэнтры. Калі ўважліва прасачыць за стужкамі навін раённых тэлеграм-каналаў, прыклады можна знайсці ці не ў кожным раёне. Калегі з Камянецкай раённай газеты паставілі надзвычай кідкі загаловак «Панфілаўцам і не снілася». Гаворка ідзе пра вуліцу Панфілаўцаў, на якой ёсць канава, відаць, для сцёку лішняй вады. І хоць па берагах пастаўлены кантэйнеры, нядбайныя гараджане ператварылі канаву ў звалку: цягнуць сюды бытавыя адходы — ад лістоў бляхі да зрэзаных галін садовых дрэў.

Чытачы івацэвіцкай раённай газеты напісалі аб праблеме лавак у горадзе. Некаторыя з іх не вытрымалі выпрабаванне зімовымі халадамі, дошкі прагнілі, а іншыя пацярпелі ад рук хуліганаў. «Насталі цёплыя дзянькі, — піша пенсіянерка, — захацелася пасядзець на сонейку, а лаўка па вуліцы Дэпутацкай зламана. Побач валяецца бутэлька з-пад піва ды нейкія лахманы».

У доўгія сакавіцкія выхадныя выязджалі з сям'ёй на прагулку ў лясны масіў урочышча Чырвоны Двор, гэта ў гарадской рысе Брэста. Мясціна прыгожая, побач рака Мухавец, маленькія вадаёмы, на ўзгорках ужо цвіце падбел. У першы дзень звярнулі ўвагу на чысціню, відавочна, што нядаўна тэрыторыю прыбіралі. Такіх жа адпачывальнікаў сустракалася нямала. Яно і зразумела: выхадны, сонейка, людзі пацягнуліся з гарадскіх кватэр да прыроды. А на трэці дзень ужо сям-там сярод ігліцы ды апалага лісця сустракаліся сурвэткі, абгорткі, шматкі паперы як сведчанні знаходжання чалавека на прыродзе. Што тут скажаш? Разважаць пра мараль, пра выхаванне, калі ўсе словы разбіваюцца, нібы тое шкло ад каменя на прыпынку? Тыя індывідуумы, што прывыклі жыць у беспарадку, брудзе і ствараць яго вакол сябе, усё роўна не прачытаюць. І кожнага не пракантралюеш. Застаецца спадзявацца, што некалі выхаванне, пра якое шмат гаворым, добры прыклад добрых людзей дадуць жаданыя вынікі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Кіраўніцтва і калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказваюць шчырыя спачуванні родным, блізкім і калегам намесніка дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі дзяржаўны геалагічны цэнтр» Аляксея Іванавіча ВАЎРЫША ў сувязі з яго заўчаснай смерцю.

Мы раздзяляем з вамі горкі боль незаменнай страты выдатнага чалавека, сапраўднага прафесіянала і калегі. Светлая памяць!